# “Заклікаю да эфектыўнага пошуку”

## З выступлення намесніка Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь Ігара Петрышэнкі

— Культура з’яўляецца асноўным сродкам захавання ідэнтычнасці народа, умацавання нацыянальнай самасвядомасці і патрыятызму. Фарміраванне аб’ектыўнага стаўлення грамадства да гістарычнага мінулага, захаванне і ўмацаванне адзінства беларускага народа — усе напрамкі, звязаныя з правядзеннем Года гістарычнай памяці, актыўна задзейнічалі сферу культуры цалкам.

Урадам прынятыя ўсе меры па забеспячэнні стабільнай працы галіны. У рэспубліканскім бюджэце прадугледжана звыш 182 млн рублёў на развіццё культуры, што на 0,21 % больш, чым у 2022 годзе. Разам з тым застаецца актуальным пытанне ўзроўню заработнай платы ў сферы. Тэндэнцыя росту ёсць. Сярэднямесячная зарплата павысілася на 40 % у параўнанні з 2020 годам. Летась рост, акрамя як павелічэннем базавай стаўкі і аднаразовай выплатай на аздараўленне, быў забяспечаны праз увядзенне надбаўкі за працу ў галіне дзякуючы прадугледжаным у кансалідаваным бюджэце сродкам, а таксама сродкам ад аптымізацыі і пазабюджэтным сродкам. Менавіта на апошнюю крыніцу хачу звярнуць увагу. Нягледзячы на павелічэнне такіх даходаў, паказчыкі яшчэ не дасягнулі дапандэмійнага ўзроўню. Арганізацыям сферы неабходна даводзіць больш напружаныя задачы па самастойным заробку.

Складанай задачай для тэатраў з’яўляецца пераход на новы механізм фінансавання. З улікам усіх крыніц даходаў і напрамкаў расходаў належыць вызначыць магчымыя рызыкі і скарэктаваць дзейнасць тэатраў. Звяртаю ўвагу, што праца па падрыхтоўцы прапаноў павінна весціся скрупулёзна і ўдумліва.

Шмат увагі летась было нададзена ўдасканаленню нарматыўнага рэгулявання сферы. Прыняты адпаведны закон, які ўдакладняе Кодэкс аб культуры. Прыняты дадатковыя меры рэгулявання ў сферы арганізацыі і правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў. Наша задача разам з мясцовымі органамі ўлады — забяспечыць кантроль і каардынацыю выканання гэтых дакументаў.

Зроблены шэраг заканадаўчых і практычных крокаў, звязаных з захаваннем гістарычнай спадчыны. Забяспечаны меры, накіраваныя на спрашчэнне ўцягнення гісторыка-культурнай спадчыны ў гаспадарчы ўжытак, залучэнне інвестараў. Паўнамоцтвы па прыняцці рашэнняў аб каштоўнасцях катэгорыі “3” перададзены аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму. Мы спадзяёмся, што гэта спросціць прыняцце рашэнняў і ў пэўнай ступені дэбюракратызуе названую сферу дзейнасці. Устаноўлены падатковыя льготы для інвестараў, якія выкарыстоўваюць капітальныя пабудовы, што з’яўляюцца культурнымі каштоўнасцямі, для прадпрымальніцкай дзейнасці. Таму мясцовыя органы павінны актыўна кіравацца гэтымі нормамі пры працы з патэнцыйнымі інвестарамі.

У апошнія гады прыняты сур’ёзныя меры па забеспячэнні арганізацый культуры і ўстаноў адукацыі музычнымі інструментамі. Рэалізаваны захады, якія забяспечваюць рамонт, набыццё і арганізацыю ўмоў для вытворчасці інструментаў у краіне. Павінны быць створаны ўсе неабходныя ўмовы для творчага развіцця дзяцей і моладзі. Лічу, што да гэтай работы можа актыўна далучыцца бізнес, не павінны заставацца ў баку прафсаюзы. Для вызначэння дакладных патрэб устаноў важна завяршыць распрацоўку нарматываў забеспячэння музычнымі інструментамі.

У 2022 годзе працягнулася ўдасканаленне сеткі ўстаноў культуры. Кіраўнікам дзяржавы даручана забяспечыць даступнасць і павышэнне якасці паслуг, у тым ліку ў сельскай мясцовасці. Гэта значыць, неабходна больш актыўна развіваць мабільныя формы абслугоўвання. Трэба звярнуць увагу на частату аказання паслуг з выкарыстаннем аўтаклубаў і бібліобусаў, на стан аўтапарку.

Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача па стварэнні запатрабаванай у гледача кінапрадукцыі. У беларускага кіно ёсць сур’ёзныя традыцыі, але нашы трохгадовыя чаканні яркага праекта пакуль не спраўдзіліся. Відавочна, нам патрэбны фільм, які захочацца пераглядзець, які стане інфанагодай і прыцягне ўвагу да айчыннага кіно.

Таксама застаецца нявырашанай значная задача па стварэнні аўтаматызаванай сістэмы “Электронная бібліятэка”. Звяртаю ўвагу, што надзвычай важна, каб рэсурс аб’яднаў ужо створаныя электронныя сістэмы, каталогі і базы. Патрабуецца ўзмацненне дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі як рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра.



Актыўнасць музейных устаноў звязана з правядзеннем Года гістарычнай памяці. Праца па распаўсюджанні дакладных звестак пра гістарычнае мінулае нашай краіны не павінна зніжаць абароты. Патрыятычнае выхаванне, фарміраванне гордасці за сваю краіну — найважнейшыя задачы, актуальнасць якіх вельмі высокая. Падтрымліваю ўсе формы супрацоўніцтва з Міністэрствам адукацыі ў частцы наведвання ўстаноў і экскурсій для навучэнцаў. Павінна весціся дзейнасць па абнаўленні форм працы. За наведвальнікаў і іх увагу трэба змагацца. Я ўпэўнены, што патэнцыял нашых музеяў, з пункту гледжання як фондаў, так і кадравых рэсурсаў, не вычарпаны.

Адзін з найважнейшых напрамкаў — падтрымка маладых талентаў. Асноўная наша задача — стымуляванне творчай моладзі, садзейнічанне яе развіццю, самарэалізацыі, прафесійнаму росту менавіта ў нашай краіне. Абавязковае павышэнне эфектыўнасці суправаджэння такіх дзяцей і моладзі, фарміраванне матывацыі на працяг навучання і працы ў Беларусі.

Звяртаюся да творчых работнікаў і заклікаю да эфектыўнага пошуку. У 2021 годзе была агучана ідэя стварэння помніка, прысвечанага адзінству беларускага народа, аднак скульптуры дагэтуль няма. Пасспяховае асэнсаванне гэтай і іншых тэм, актуальных для дзяржавы і грамадства, абавязкова павінна стаць часткай сучаснай беларускай культуры.